**Ганна САВІЧ**

***

Ранак, і на сэрцы лёгкасць,
Мары акрыляюць,
На зяленых нівах росы
Крышталямі ззяюць.

Ёсць цудоўныя мясціны
На зямлі ўсюды,
Ды ўстае перад вачыма
Край, што сэрцу любы.

Над ракою хуткацечнай
Тчэцца клін птушыны,
Так вяртаюцца ўжо птушкі
Да сваёй Радзімы.

Неразрыўныя над рэчкай
Танчаць у сіняй высі,
Паляцяць яны, дарэчы,
Аж да Беларусі.

Там азёры, як люстэркі,
Сосны аж да неба,
Да душы ўсё прырастае,
Як духмянасць хлеба.

Карані мае ў мястэчку,
Дзе расла з бацькамі,
Незабыўнае маленства,
З мёдам хлеб духмяны.

Успамін: мая Радзіма –
Васількі ў жыце,
Нагадае краю сімвал:
Сваё беражыце!

Маю я ў скарбонцы сэрца
У радасці і ў скрусе
Шчырую любоў да роднай,
Любай Беларусі!